ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
06.08.2020 № 213

**Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце**
**«Развіццё маўлення»**
для I–III класаў спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы
(спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната)
для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення з беларускай мовай навучання і выхавання

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Развіццё маўлення» (далей – вучэбная праграма) прызначана для I–III класаў спецыяльных агульнаадукацыйных школ (спецыяльных агульнаадукацыйных школ-інтэрнатаў) для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення (далей – ЦПМ).

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 34 гадзіны ў I, II класах і 35 гадзін у III класе.

3. Мэта навучання – фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі як здольнасці і гатоўнасці ажыццяўляць зносіны ў адзінстве ўсіх яго функцый: інтэрактыўнай (узаемадзеянне), камунікатыўнай (абмен інфармацыяй) і сацыяльна-перцэпцыйнай (успрыманне і разуменне чалавека чалавекам) у розных сітуацыях.

4. Для дасягнення мэты навучання неабходна рашэнне наступных задач:

фарміраваць прагматычную кампетэнцыю, якая ўяўляецца як здольнасць праяўляць маўленчую актыўнасць, арыентавацца ў сітуацыі зносін, адэкватна падбіраць моўныя сродкі і будаваць выказванне ў адпаведнасці з камунікатыўным намерам таго, хто гаворыць і магчымасцямі суразмоўцы;

фарміраваць лінгвістычную (моўную) кампетэнцыю, якая вызначаецца як здольнасць валодаць лексічнымі, марфалагічнымі, сінтаксічнымі і фаналагічнымі сродкамі мовы і ўменне карыстацца імі ў маўленні;

фарміраваць маўленчую (дыскурсіўную) (ад лац. discursus – гутарка, размова) кампетэнцыю, якая праяўляецца ў здольнасці разумець выказванне субяседніка і выказваць уласныя думкі ў выглядзе цэласнага, звязнага і лагічнага выказвання;

фарміраваць сацыяльна-асобасную кампетэнцыю, якая азначае далучэнне навучэнцаў з ЦПМ да сацыяльнага вопыту, засваенне пэўных сацыяльных норм і каштоўнасцей, якія забяспечваюць эфектыўнае ўзаемадзеянне з іншымі людзьмі ў працэсе зносін;

фарміраваць вучэбна-пазнавальную кампетэнцыю, якая ўключае авалоданне рэгуляцыйнымі і пазнавальнымі ўніверсальнымі вучэбнымі дзеяннямі.

Увядзенне ў сістэму навучання мове вучняў з ЦПМ вучэбнага прадмета «Развіццё маўлення» абумоўлена, з аднаго боку, асаблівасцямі іх моўнага развіцця, няўменнем арыентавацца ў сітуацыі зносін, недастатковым засваенні спосабаў маўленчых паводзін, нізкай камунікатыўнай актыўнасцю, а з другога боку – цеснай сувяззю мовы з інтэлектуальным, эмацыйным і сацыяльным развіццём.

Змест дадзенай вучэбнай праграммы накіраваны на фарміраванне ў вучняў маўленчай дзейнасці, практыкі маўленчых зносін, у працэсе якіх адбываецца ўзбагачэнне і ўдакладненне слоўнікавага запасу, авалоданне асноўнымі заканамернасцямі граматычнага ладу мовы, засваенне розных форм (дыялагічная і маналагічная), відаў (вусная і пісьмовая) і тыпаў (паведамленне, апавяданне, апісанне, разважанне) мовы. Вучні з ЦПМ прызвычайваюцца назіраць, аналізаваць і абагульняць розныя працэсы моўнай рэчаіснасці.

Маўленчыя зносіны адыгрываюць важную ролю, паколькі выступаюць і як сродак навучання, і як сродак развіцця мыслення, уяўлення, інтэлектуальных і творчых здольнасцей і да таго ж з’яўляецца асновай сацыялізацыі асобы. У працэсе зносін ажыццяўляецца непасрэдны абмен інфармацыяй, ведамі, ідэямі, дзеяннямі і ўчынкамі, успрыманне людзьмі адзін аднаго і ўсталяванне на гэтай аснове ўзаемаразумення.

Метадалагічную аснову навучання маўленчым зносінам складаюць камунікатыўна-дзейнасны, культуралагічны, асобасна арыентаваны і кампетэнтнасны падыходы.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход прадугледжвае навучанне навучэнцаў маўленчым зносінам як віду дзейнасці ў працэсе вучэбнага супрацоўніцтва, у якім зацікаўлены і ініцыятыўныя як настаўнік, так і навучэнцы. Дадзены падыход у навучанні садзейнічае развіццю ў навучэнцаў мовамысленчых і творчых здольнасцей, выхаванню сацыяльна значных якасцей асобы, абуджае цікавасць да стваральнай творчай дзейнасці.

Культуралагічны падыход азначае рэалізацыю адзінства і ўзаемадзеення мовы, культуры і асобы ў працэсе навучання; накіраванасць зместу навучання на выхаванне духоўных, маральных якасцей асобы; далучэнне навучэнцаў да культурных каштоўнасцей; усведамленне сябе як асобы, якая належыць да пэўнай культурнай і моўнай супольнасці.

Асобасна арыентаваны падыход прадугледжвае, што ў цэнтры ўвагі знаходзіцца вучань з яго інтарэсамі, патрэбамі, здольнасцямі. Пры арганізацыі навучання ўлічваецца маўленчы вопыт, псіхафізічныя асаблівасці. Вучань выступае актыўным суб'ектам камунікатыўнай дзейнасці, якая фарміруе яго як моўную асобу.

Кампетэнтнасны падыход акцэнтуе ўвагу на выніку адукацыі: разглядаецца не сума засвоенай інфармацыі навучэнцаў з ЦПМ, а іх здольнасць дзейнічаць у розных праблемных сітуацыях.

Рэалізацыя зместу дадзенай вучэбнай праграмы прадугледжвае выкарыстанне шэрагу прынцыпаў.

Прынцып камунікатыўнай накіраванасці прадугледжвае перанясенне акцэнту з вывучэння мовы як сістэмы, на навучанне маўленчым зносінам ва ўмовах актыўнай камунікатыўнай практыкі. Асаблівасцю дадзенага прынцыпу з’яўляецца тое, што мадэллю зносін выступае сам працэс навучання. Умовы, максімальна набліжаныя да натуральных зносін, ствараюцца пры дапамозе мадэлявання маўленчых сітуацый, якія выступаюць як форма арганізацыі працэсу навучання і як сістэма ўзаемаадносін навучэнцаў. Выкарыстанне маўленчых сітуацый спрыяе паспяховаму авалоданню навучэнцамі камунікатыўнымі ўменнямі і наступным іх ужываннем у новых камунікатыўных умовах.

Прынцып культуралагічнасці азначае накіраванасць зместу навучання на комплекснае фарміраванне пазнавальных каштоўнасцей, выхаванне духоўных, маральных, эстэтычных якасцей асобы; у ходзе адукацыі перадаецца сацыяльны вопыт.

Прынцып функцыянальнасці забяспечвае засваенне формы маўленчых адзінак на аснове выканання імі маўленчых функцый, адпаведных вырашаемым задачам: пацвердзіць, даведацца, пахваліць і гэтак далей.

Прынцып асобаснай арыентацыі зносін улічвае індывідуальнасць кожнага вучня, яго здольнасці і магчымасці, жыццёвы вопыт і інтарэсы, пачуцці і эмоцыі. Змест зносін будуецца на абмеркаванні актуальных жыццёвых праблем. Пры гэтым кожны вучань атрымлівае магчымасць абмяркоўваць падзеі, вучыцца выказваць свае адносіны да таго, што адбываецца, абгрунтоўваць і адстойваць уласнае меркаванне.

Прынцып развіцця мовамысленчай актыўнасці заключаецца ў падахвочванні вучняў з ЦПМ да рашэння задач зносін праз ажыццяўленне сістэмы разумовых аперацый. Змест зносін складаюць праблемныя сітуацыі. Кожнае камунікатыўнае заданне ўключае мовамысленчую задачу, рашэнне якой стымулюе маўленчую і пазнавальную актыўнасць навучэнцаў, выклікае камунікатыўную інтэнцыю, развівае механізмы мыслення. Вялікае значэнне ў забеспячэнні мовамысленчай актыўнасці навучэнцаў набывае эмацыйна станоўчая атмасфера навучання, камунікатыўна-значны для навучэнцаў маўленчы матэрыял, выбар праблемы зносін з улікам узроставых інтарэсаў.

Прынцып сітуатыўна-тэматычнай арганізацыі маўленчага матэрыялу азначае, што ў якасці адзінкі арганізацыі навучальнага маўленчага матэрыялу выступае сітуацыя. Сітуацыі, закладзеныя ў вучэбны маўленчы матэрыял, з аднаго боку, з’яўляюцца мадэллю зносін у дадзеных канкрэтных умовах, з другога – маўленчыя адзінкі, якія ўваходзяць у склад сітуацыі, дазваляюць рэалізоўваць мноства іншых жыццёвых сітуацый, але ўжо ў новых умовах. Змястоўнай базай арганізацыі маўленчага матэрыялу з’яўляюцца праблемы зносін, якія ўключаюць прадметы абмеркавання: падзея, учынак, паняцце, з’ява і гэтак далей.

Паэтапна-цыклічны прынцып арганізацыі працэсу навучання праяўляецца ў тым, што авалоданне маўленчымі зносінамі ажыццяўляецца праз паэтапнае фарміраванне камунікатыўных уменняў, якія цыклічна паўтараюцца на працягу ўсіх гадоў навучання. Пры гэтым кожны раз маўленчыя сітуацыі змяняюцца, маўленчы матэрыял і віды камунікатыўных заданняў ускладняюцца. Канцэнтрычнае размяшчэнне тэм забяспечвае трываласць запамінання маўленчага матэрыялу, дазваляе паступова нарошчваць слоўнік і ўводзіць у маўленне новыя граматычныя канструкцыі, дае магчымасць планамерна парадкаваць і сістэматызаваць запас жыццёвых уяўленняў, які расце з узростам вучняў, а таксама выкарыстоўваць засвоены раней вопыт у дачыненні да новых сітуацый зносін.

5. Рэкамендаваныя формы і метады для ўрокаў па вучэбным прадмеце «Развіццё маўлення» праводзяцца з выкарыстаннем займальнага матэрыялу. Выкарыстаюцца індывідуальная і групавая пошукава-даследчая дзейнасць, якая арыентуе навучэнцаў на самастойны пошук маўленчых сітуацый; віктарыны, конкурсы, на якіх вучні праяўляюць свае маўленчыя магчымасці і творчыя здольнасці.

Асноўны змест навучання маўленчым зносінам прадстаўлены сукупнасцю маўленчых і камунікатыўных уменняў, якія адпавядаюць вылучаным кампетэнцыям і забяспечваюць вучням з ЦПМ здольнасць успрымаць і спараджаць цэласныя выказванні адэкватна канкрэтнай сітуацыі зносін, вырашаць задачы ўзаемадзеяння, узбагачаць свой сацыяльны вопыт, засвойваць і выказваць нормы адносін да свету і людзей.

Фарміраванне камунікатыўных уменняў ажыццяўляецца метадам практычнага навучання зносінам з дапамогай выкарыстання ў адукацыйным працэсе натуральна ўзнікаючых і спецыяльна мадэляваных маўленчых сітуацый. Шырока прымяняюцца гульнёвыя метады навучання (дыдактычныя, сюжэтна-ролевыя гульні), драматызацыя.

Маўленчы матэрыял уключае ў сябе слоўнік гутарковай мовы, сітуатыўна-тэматычны слоўнік, фразы для выражэння камунікатыўных намераў, даручэнні, тэксты розных жанраў і стыляў. Навучанне маўленчым зносінам будуецца з улікам камунікатыўных магчымасцей вучняў, пачынаючы з фарміравання ўмення разумець інфармацыю суразмоўцы, рэагуючы на яе асобным словам або фразай, да ўменняў весці гутарку лагічна і звязна, злучаючы асобныя фразы ў сверхфразавыя адзінствы дыскурсу.

Ускладненне зместу навучання зносінам ажыццяўляецца ў трох накірунках:

павелічэнне ступені самастойнасці пры стварэнні выказванняў;

удасканаленне фаналагічных, лексіка-граматычных абагульненняў, сінтаксічнай структуры фраз;

пашырэнне спосабаў паводзін у розных сітуацыях, рашэнне мовамысленчых задач.

Асаблівасцю ўрокаў па вучэбным прадмеце «Развіццё маўлення» з’яўляецца вуснае апераджэнне. На кожным уроку педагагічны работнік ўжывае ў маўленні тыя граматычныя з’явы, аналіз і адпрацоўка якіх прадугледжаны значна пазней. За гэты час вучні не толькі апазнаюць гэтыя з’явы ў вусным маўленні, але і ўжываюць на ўзроўні рэпрадукцыі. Гэтаму спрыяе шматразовае ўжыванне маўленчых канструкцый у разнастайных маўленчых сітуацыях.

У рамках прадстаўленых тэм уключаецца матэрыял, які дазваляе арганізаваць работу па фарміраванні розных відаў маўленчай дзейнасці: слуханне, гаварэнне, чытанне і пісьмо. Аднак для непасрэдных зносін характэрна менавіта вусная форма мовы (абмен рэплікамі, дыялог, гутарка), таму асноўная ўвага надаецца разуменню маўлення і стварэнню ўласных выказванняў.

У змесце працы ўнутры тэм па фарміраванні камунікатыўных уменняў для ажыццяўлення зносін (у вуснай форме) можна ўмоўна вылучыць наступныя раздзелы:

«Работа над разуменнем маўлення»;

«Работа над словам»;

«Работа над сказам»;

«Работа над звязным маўленнем (развіццё дыялагічнага і маналагічнага маўлення);

«Маўленчы этыкет».

Раздзел «Работа над разуменнем маўлення» ўключае разуменне і выкананне даручэнняў, фармуляванне адказаў на пытанні. Педагагічны працоўны, выкарыстоўваючы пабуджальнае маўленне (даручэнні, загады, просьбы), арганізуе дзейнасць навучэнцаў, паведамляе ім неабходны маўленчы матэрыял у абстаноўцы, максімальна набліжанай да сітуацыі натуральных зносін, што спрыяе разуменню мовы, карэкцыі і ўдакладненню наяўнага ў іх маўленчага запасу. Ад пабуджальных фраз педагог пераходзіць да пытанняў. Асаблівай увагі патрабуе праца па развіцці разумення сказавых канструкцый. Аб разуменні маўлення навучэнцамі можна меркаваць па тым, як яны выконваюць даручэнні, адказваюць на праблемныя сітуацыі.

Пасля таго як вучні з ЦПМ навучацца разумець пабуджальную фразу пэўнай канструкцыі, яны пачынаюць практыкавацца ў перадачы даручэнняў і загадаў адзін аднаму. Ад кароткіх пабуджальных фраз паступова пераходзяць да больш распаўсюджаных даручэнняў і загадаў, на аснове якіх ажыццяўляецца ўвядзенне ў гаворку апавядальных, пытальных сказаў розных сінтаксічных канструкцый. Структурныя разнавіднасці сказаў уводзяцца ў размову з паступовым ускладненнем, так, каб раней засвоеныя словазлучэнні ўваходзілі ў якасці канструктыўных элементаў новых для дзяцей сінтаксічных канструкцый. Напрыклад: «Даша, раздай сшыткі». «Даша, раздай сшыткі, якія ляжаць у мяне на стале».

Раздзел «Работа над словам» прадстаўлены двума напрамкамі. У рамках першага кірунку ажыццяўляецца пашырэнне, удакладненне слоўнікавага запасу, фарміраванне ўяўленняў аб абагульненым лексіка-граматычным значэнні слова (словы-прадметы, словы-прыкметы, словы-дзеянні) і трэніроўка ў правільным ужыванні слоў розных марфалагічных катэгорый у самастойнай вуснай мове вучняў.

Развіццё слоўнікавага запасу ажыццяўляецца ў цеснай сувязі з развіццём пазнавальнай дзейнасці вучняў. У працэсе практычнай маўленчай дзейнасці яны вучацца вылучаць істотныя прыкметы прадметаў і з’яў, выкрываць сувязі і адносіны паміж імі, групаваць словы па розных лексіка-семантычных прыкметах (родавых адносінах, адносінах частка-цэлае, па падабенстве або супрацьлегласці значэнняў і гэтак далей), знаходзіць і правільна выкарыстоўваць у мове антонімы і сінонімы.

Другі напрамак работы забяспечвае фарміраванне ўмення карыстацца рознымі спосабамі словаўтварэння і актыўнага яго прымянення ў складзе розных словазлучэнняў і сказаў. Фарміраванне моўных навыкаў абапіраецца на розныя формы нагляднасці, не толькі прадметнай, але і прадстаўленай у выглядзе карцін, схем, знакаў і праводзіцца паэтапна з падключэннем знешняга прагаворвання.

Раздзел «Работа над сказам» уключае два напрамкі. Першы накірунак прадугледжвае развіццё і ўдасканаленне граматычнага афармлення мовы шляхам практычнага авалодання словазлучэннямі розных тыпаў: іменнымі (дом бацькі, старое дрэва; ветлівы са старэйшымі); дзеяслоўнымі (увайсці ў дом, перайсці вуліцу, гучна крычаць); дзеепрыслоўнымі (вельмі ціха, занадта салодка). Пры гэтым асноўны акцэнт робіцца на развіццё ўмення будаваць сказа-склонавыя канструкцыі, пашырэнні набору прыназоўнікаў, якія маюць розныя значэнні.

Другі напрамак прадугледжвае навучанне складанню і ўжыванню ў маўленні розных тыпаў сказаў. Важнае месца адводзіцца такім відам працы, як мадэляванне і канструяванне сказаў, што спрыяе фарміраванню працэсаў аналізу, сінтэзу і абагульненню на сінтаксічным узроўні.

У працэсе фарміравання і замацавання навыкаў пабудовы словазлучэнняў ці сказаў адначасова ўдакладняюцца марфалагічныя асаблівасці слоў, якія ўваходзяць у яго (род, лік, склон, трыванне, час, асоба і гэтак далей). Мадэлі (тыпы) сказаў ускладняюцца з класа ў клас. Авалоданне граматычным ладам мовы вядзецца ў практычным плане без

ужывання граматычных тэрмінаў, шляхам фарміравання моўных (марфалагічных і сінтаксічных) абагульненняў. Фарміраванне розных канструкцый сказа ажыццяўляецца як на аснове маўленчых узораў, так і на аснове дэманструючых дзеянняў, з выкарыстаннем ілюстрацый.

У рабоце над сказам вялікая ўвага надаецца семантычным сувязям паміж словамі сказа (з выкарыстаннем пытанняў, супастаўлення па значэнні, верыфікацыі сказаў, рознай сімвалізацыі).

Раздзел «Работа над звязным маўленнем» прадугледжвае авалоданне дыялагічнай і маналагічнай формамі маўлення. Дыялог з'яўляецца найбольш даступнай і натуральнай формай сітуацыйна парнага ўзаемадзеяння. Яму ўласціва чаргаванне рэплік суразмоўцы, якое ажыццяўляецца без папярэдняга абдумвання і непасрэдна звязана са створанай маўленчай сітуацыяй, з тэмай размовы і рэакцыяй суразмоўцы. Для вядзення дыялогу важна навучыць вучняў з ЦПМ пабудове рэплік. Фарміруюцца асноўныя камунікатыўныя ўменні на аснове камунікатыўных актаў, якія ўяўляюць сабой дыялагічнае адзінства рэплікі-стымулу і рэплікі-рэакцыі без дальнейшага развіцця дыялогу. Далей засвоеныя камунікатыўныя акты ўключаюцца ў склад дыялагічных адзінстваў і здольныя выконваць функцыю паўнавартасных зносін.

Маналагічнае выказванне варта разумець як кампанент працэсу зносін любога ўзроўню – парнага, групавога, калектыўнага. Гэта адрэзак мовы, які знаходзіцца паміж двума выказваннямі. Таму маналагічнае выказванне дыялагічна па сваёй прыродзе і нямыслімае без наяўнасці маўленчых партнёраў.

Работа над усімі раздзеламі вядзецца паралельна, аднак пры неабходнасці, з улікам магчымасцей навучэнцаў, настаўнік можа прысвяціць больш часу асобным кірункам. У навучанні маўленчым зносінам выкарыстоўваюцца рознаўзроўневыя камунікатыўныя заданні, у якіх устаноўка на зносіны закладзена ў самой іх арганізацыі на аснове камунікатыўных задач, асноўнымі з якіх з'яўляюцца: паведамленне – расказаць, апісаць, інфармаваць; тлумачэнне – паказаць, вылучыць, адзначыць; пытанне – спытаць, удакладніць, даведацца; пабуджэнне – даказаць, пераканаць, угаварыць; адабрэнне – пацвердзіць, пахваліць, падзякаваць; асуджэнне – запярэчыць, абвергнуць, аспрэчыць. Выкарыстоўваецца яшчэ адзін від устаноўкі, якая прадугледжвае ад прамоўцы самастойнасці ў выбары мэты выказвання: «Як ты думаеш ...?», «Як ты лічыш ... ?», «Выкажы сваё меркаванне аб ...».

На ўроках прымяняюцца аперацыйныя і матэрыяльныя сродкі. Аперацыйныя сродкі – гэта тыя дзеянні, якімі аперуе педагог і навучэнец – імітацыя, падстаноўка, трансфармацыя, рэпрадукцыя, камбінаванне, апярэджанне, здагадка і гэтак далей. Матэрыяльнымі сродкамі выступаюць вербальныя – лексічныя адзінкі, маўленчыя ўзоры, тэкст, план і іншае; ілюстрацыйныя – малюнак, фатаграфія, карціна і іншае; схематычныя – апорная схема, табліца, інструктыўныя карткі.

Дадзеная вучэбная праграма адлюстроўвае базавы аб'ём матэрыялу для навучання вучняў з ЦПМ. Пералічаныя ў дадзенай вучэбнай праграме выказванні з паступова ўскладненымі канструкцыямі з'яўляюцца тыпавымі. Узорамі гэтых фраз карыстаецца педагагічны работнік, напаўняючы паказаную структуру зместам, адпаведным канкрэтнай сітуацыі, тэме. Прадстаўлены маўленчы матэрыял з'яўляецца абавязковым як для разумення, так і для актыўнага выкарыстання самімі навучэнцамі. Работа па развіцці маўленчых зносін працягваецца ў ходзе ўсяго адукацыйнага працэсу.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

### I клас (34 г.)

Сітуатыўна-тэматычны змест зносін: «Мой першы школьны дзень» (1 г.), «Знаёмства, прывітанне, развітанне» (1 г.), «Мае школьныя рэчы» (1 г.), «Мы вучымся» (1 г.), «Мой клас» (1 г.), «Мая школа» (1 г.), «Прыкметы восені» (1 г.), «Дары восені»

(1 г.), «Рыхтуем пачастунак» (1 г.), «Чароўныя словы» (1 г.), «Я і мае сябры» (1 г.), «Дзень нараджэння» (1 г.), «З Новым годам!» (1 г.), «Зімовыя забавы» (1 г.), «Лепім снегавіка» (1 г.), «Мая сям'я» (1 г.), «Памочнікі» (1 г.), «Вучымся размаўляць» (1 г.), «Правілы зносін» (1 г.), «Жаночы дзень 8 сакавіка» (1 г.), «Сустракаем вясну» (1 г.), «Мы ідзём купляць» (1 г.), «У краме» (1 г.), «Мае любімыя цацкі» (1 г.), «Гуляем разам» (1 г.), «Мае эмоцыі і пачуцці» (1 г.), «Настрой» (1 г.), «Добрыя ўчынкі» (1 г.), «Добра, што на свеце ёсць дабрыня!» (1 г.), «Мая любімая жывёла» (1 г.), «Клопат пра жывёл» (1 г.), «Дзікія жывёлы» (1 г.), «Добры дзень, лета!» (1 г.), «Летні адпачынак» (1 г.).

Камунікатыўныя ўменні і маўленчыя формы іх выражэння

Работа над разуменнем мовы

Уменні, якія фарміруюцца:

разумець сказанае і адэкватна сітуацыі рэагаваць;

выконваць даручэнні: «Сядзь (-це)», «Дай (-це) сшытак», «Вазьмі (-це) чырвоную ручку», «Прыбяры (-це) сшытак і кнігу», «Разгарні (-це) кнігу на старонцы трыццаць два», «Пакладзі (-ці) альбом справа», «Збяры сшыткі па беларускай мове і пакладзі іх на стол», «Працуй хутчэй!»*, Рабі акуратна!», «Скажы, што трэба зрабіць»*, «Пакажы, як трэба зрабіць»*;

выказваць славесна разуменне / неразуменне: «Добра», «Згодна», «Я не зразумеў (-ла)»;

выказваць просьбу, пабуджэнне: «Дайце мне, калі ласка, пэндзлік (альбом і фарбы)», «Пакажы (-це), калі ласка, мне не відаць», «Дапамажы (-це), калі ласка, я не ведаю, як рашыць гэтую задачу»*, «Паглядзі (-це), калі ласка, мой сшытак»*;

звярнуцца да таварыша па заданні настаўніка: «Дай ручку Дзіму». «Дзіма! Вазьмі ручку»; «Папрасі кнігу ў Тані». «Таня, дай, калі ласка кгігу»; «Папрасі ў Сашы просты аловак і дай яго мне»*. «Саша! Дай просты аловак для Марыі Іванаўны»*;

даваць даручэнне адзін аднаму: «Коля, палі кветкі». «Дзеці, здайце малюнкі»*;

фармуляваць адказ пра выкананыя дзеянні: «Я расклаў карцінкі», «Я паклаў кнігу на паліцу», «Я намаляваў дом, цяпер буду маляваць дрэва»*;

ацэньваць вынікі сваёй працы: «Добра / дрэнна», «Правільна / няправільна», «Прыгожа / непрыгожа».

Работа над словам

Тэматычны слоўнік

Уменні, якія фарміруюцца:

выкарыстоўваць словы, якія абазначаюць прадметы, дзеянні, прыкметы прадметаў (па колеры, якасці, прыналежнасці, прызначэнні) у адпаведнасці з тэмай урока.

Семантычны слоўнік

Уменні, якія фарміруюцца:

разумець і называць абагульняючыя словы;

дыферэнцыраваць канкрэтныя словы, якія адносяцца да абагульняючага паняцця, вызначаць падабенства і адрозненні ў значэнні абагульняючых слоў (транспарт – машына, самалёт, аўтобус, катэр, трактар і гэтак далей; транспарт – наземны, паветраны, водны);

разумець і выкарыстоўваць словы, якія абазначаюць адзін прадмет у розных сітуацыях (шчотка – зубная, для чысткі адзення, абутку, для падмятання падлогі; складаць – лічбы, вопратку, вучэбныя рэчы);

разумець і ўжываць: словы са значэннем памяншальна-ласкальнасці, павелічэння (з суфіксамі -ік, -ск-, -к-, -чак, -ачк-, -ечк-, -ішч-, -аньк-, -еньк-); словы, якія абазначаюць асоб па роду дзейнасці (з суфіксамі -чык, -іст, -нік, -ніц-, -ар); словы, якія абазначаюць жывёл (назоўнікі з суфіксам -ян, ёнак); словы, якія абазначаюць прыкметы прадметаў па колеры, форме, велічыні, густу, вазе, тэмпературных уласцівасцях, матэрыяле, з якога ён зроблены (драўляны, шкляны, жалезны), якасці (цвёрды, мяккі, гладкі, пухнаты); словы руху з рознымі прыстаўкамі (у-, вы-, пера-, пад-, ад); словы, якія абазначаюць прыкметы

дзеяння (хутка, весела, добра), накірунак, месца, час дзеяння (раніцай, вечарам, сёння); прыназоўнікі, якія абазначаюць напрамак, месца дзеяння (у, на, пад, над, у, з, ад, да);

выкарыстаць словы, процілеглыя па значэнні: назоўнікі (дзень – ноч), прыметнікі (добры – дрэнны), дзеясловы (маўчыць – кажа);

класіфікаваць прадметы і словы па родавідавых адносінах, у адносінах «частка – цэлае»;

разумець і выкарыстоўваць у мове сінонімы (ісці – крочыць; смелы – адважны; весялосць – радасць);

карыстацца словам і правільнай граматычнай формай у залежнасці ад яе значэння ў саставе сказа.

Работа над сказам (выказваннем)

Уменні, якія фарміруюцца:

дапасоўваць прыметнікі да назоўнікаў адзіночнага ліку ў родзе і склоне і ў назоўным склоне множнага ліку;

ужываць склонавыя формы назоўнікаў адзіночнага ліку без прыназоўнікаў у вінавальным склоне (неадушаўлёных і адушаўлёных), у родным склоне (няма стала), у творным склоне са значэннем прадмета, якім выконваеш дзеянне (малюе алоўкам), у давальным склоне са значэннем адрасата (дорыць сястры);

выкарыстоўваць словазлучэнні дзеясloў з назоўнікам: у вінавальным склоне з прыназоўнікам у, на, пад (паставіў у (на, пад) стол, паклаў у (на, пад) кнігу); у месным склоне з прыназоўнікам у, на (ляжыць у стале, на стале); у творным склоне з прыназоўнікам пад, над, за (схаваўся пад (за) кустом); у родным склоне з прыназоўнікам з, ад, каля ў значэнні месца, адкуль выконваецца дзеянне (выйшаў з хаты, сышоў з цягніка, ад'ехаў ад крамы, стаіць каля кіёска); у родным склоне з прыназоўнікам да ў значэнні асобы або месца, да якога накіравана дзеянне (падышоў да таварыша); у творным склоне з прыназоўнікам з у значэнні сумеснасці або суправаджэння (ідзе з мамай); у давальным склоне ў значэнні адрасата;

выкарыстоўваць назоўнік у родным склоне з прыназоўнікам «у», і без прыназоўніка ў значэнні прыналежнасці прадмета або яго адмаўлення (у казы, няма казы);

спалучаць колькасныя лічэбнікі (адзін, адна, адно, два, тры, чатыры, пяць) і назоўнікі (у хлопчыка два шары, пяць шароў);

складаць сказы, у якіх дзейнік выражаны назоўнікам, выказнік – дзеясловам, тыпу: дзейнік – выказнік – прамое дапаўненне (дзяўчынка рве кветкі); дзейнік – выказнік – прамое дапаўненне – ускоснае дапаўненне (хлопчык ловіць рыбу вудай); дзейнік – выказнік – акалічнасць месца, выражаная назоўнікам з прыназоўнікам (птушкі сядзяць на дрэве); дзейнік – выказнік – прамое дапаўненне – акалічнасць месца, выражаная назоўнікам з прыназоўнікам (мама паклала яблыкі на стол); азначэнне – дзейнік – выказнік (вялікі сабака брэша), дзейнік – выказнік – акалічнасць спосабу дзеяння, выражаная прыслоўем (чарапаха поўзае павольна);

адрозніваць і правільна ўжываць у мове сказы розных відаў: пабуджальныя, пытальныя, апавядальныя, клічныя;

ужываць у мове неразвітыя і развітыя сказы (з 1–5 слоў);

выкарыстоўваць у мове сказы, у якіх дзейнік і выказнік выражаны назоўнікам у назоўным склоне: Мінск – гэта сталіца. Маліна – гэта ягада;

адрозніваць у сказе словы, якія абазначаюць прадметы і адказваюць на пытанні: «Хто?» ці «Што?»; і словы, якія абазначаюць дзеянне, якія адказваюць на пытанні «Што робіць?», «Што зрабіў?»;

дыферэнцыраваць пытанні «Хто?» і «Што?», якія адносяцца да адушаўлёных або неадушаўлёных прадметаў: «Хто гэта?» «Што гэта?»;

дыферэнцыраваць пытанні, якія адносяцца да дзеянняў у цяперашнім або прошлым часе «Што робіць?», «Што рабіў?»;

развіваць сказы, выкарыстоўваючы прыметнікі, якія адказваюць на пытанні «Які?», «Якая?», «Якое?», «Якія?».

Работа над звязнай мовай

Дыялагічнае маўленне

Уменні, якія фарміруюцца:

ужываць ініцыіруючыя і адказваючыя рэплікі ў пытальна-адказных дыялагічных адзінствах (у выглядзе простых фраз з апорай на маўленчы ўзор). Спытай: «Хто рашыў прыклады?». Паведамі: «Я рашыў прыклады». Спытай: «Саша, пойдзеш гуляць у футбол?». Падцвердзі: «Я пайду гуляць у футбол». Удакладні: «Коля, ты любіш бананы або персікі?». Паведамі: «Не, я люблю грушы»;

будаваць пытальна-адказныя дыялогі па зададзенай маўленчай сітуацыі. Даведайся: «Хто пойдзе ў кіно?». Адкажы: «Я пайду ў кіно». Удакладні: «У колькі?»;

будаваць дыялагічныя адзінствы, якія ўключаюць паведамленне, пытанне і адказ на яго. Паведамі: «Я малюю дом. А ты?». Падцвердзі: «І я малюю дом». Запярэч: «А я малюю кветкі»;

будаваць дыялагічныя адзінствы, якія ўключаюць паведамленне і пытанне. Паведамі: «Я прынесла маю любімую кнігу». Даведайся: «Якую?»;

будаваць дыялагічныя адзінствы, якія ўключаюць паведамленне аб чым-небудзь і паведамленне: «Увесну птушкі адлятаюць на поўдзень. Пагадзіся або запярэч». – «Не. Увесну птушкі прылятаюць з поўдня»;

будаваць дыялагічныя адзінствы, якія ўключаюць пабуджэнне да дзеяння і пытанне (адказ). Звярніся да таварыша з просьбай: «Прынясі, калі ласка, кнігу». Удакладні: «Дзе яна ляжыць»?;

будаваць дыялагічныя адзінствы, якія ўключаюць пабуджэнне да дзеяння і альтэрнатыўную рэакцыю (згода ці адмова): «Рабі ўрокі!». Пагадзіся або запярэч». – «Добра!»;

будаваць дыялагічныя адзінствы, якія ўключаюць прывітанне, зварот, праяўляючы маўленчую актыўнасць, выбіраючы для пачатку размовы моўныя сродкі, адэкватныя сваёй камунікатыўнай ролі: «Добры дзень, Марыя Іванаўна!». «Прывітанне, Паўлік!». «Добрай раніцы, мамачка!»;

падтрымаць зносіны, адказваць на пытанні:

пра сябе, пра сябра, пра сям’ю: «Як цябе завуць?» – «Маша / Мяне завуць Маша»; «Як тваё прозвішча?» («Назаві сваё прозвішча»*) – «Іванова / Маё прозвішча Іванова». «Колькі табе гадоў?» – «Сем / Мне сем гадоў». «У якім класе ты вучышся?» – «У першым/ Я вучуся ў першым класе». «Як завуць маму, тату/ Дзе працуюць/ Які твой адрас?»;

аб сумеснай дзейнасці: «Хто сёння дзяжурны?» – «Я / Я сёння дзяжурны». «Якая сёння (была ўчора, будзе заўтра) дата?». «Які сёння (быў учора, будзе заўтра) дзень тыдня?». «Які зараз урок? / Які па чарзе?». «Хто сёння (быў учора, будзе заўтра) дзяжурны»?. «Якое сёння (было ўчора) надвор’е?». «Які зараз месяц?». «Што будзем рабіць сёння?». Што ты зрабіў спачатку?»*. Хто гатовы адказваць?»*. Пойдзем гуляць у хакей. – «Пойдзем / Добра /Я не хачу)»;

пазнавальнага характару: «Што гэта?». «Якога колеру (формы, памеру) гэты прадмет?». «Для чаго ён неабходны?»;

пра падзеі ў часе: «Што ты рабіў раніцай?». «Што мы рабілі сёння?». «Што Коля будзе рабіць заўтра?». «Што ты рабіў на вакацыях?»;

запытваць неабходную інфармацыю, задаваць пытанні для атрымання інфармацыі: «Хто гэта?», «Што гэта?», «Што робіць?», «Што робяць?», «Які?», «Якая?», «Якое?», «Якія?»; «Круглы?», «Чырвоны?»; «Вялікі або маленькі?»; «Ходзіць?», «Лётае?»; «Бегае або скача?»; «На якой старонцы?»;

рэалізоўваць уласны камунікатыўны намер, выказаць просьбу: «Дай мне, калі ласка, ручку (аловак, сшытак і кнігу і іншае)»;

выказаць забарону: «Нельга! / Не перашкаджай! / Не спяшайся!»;

паведамляць (распавесці, праінфармаваць, далажыць, апавясціць) пра дзейнасць:

аб сумеснай дзейнасці: «Будзем гаварыць», «Будзем маляваць гародніну», «Спачатку будзем чытаць, а потым будзем адказваць на пытанні»;

аб уласнай дзейнасці: «Я ўзяў ручку (сіні аловак і інш.)», «Я адкрыў сшытак (кнігу, альбом і іншае»;

аб дзейнасці аднакласніка: «Таня намалявала яблык (чырвоны яблык, яблык і грушу і іншае)»;

рэалізоўваць камунікатыўна-ацэначныя функцыі (згода, адабрэнне, спачуванне, незадавальненне, папрок): дакладна / няправільна; добра / дрэнна; я ведаю / я не ведаю; я ўмею / я не ўмею;

завяршаць зносіны: «Да пабачэння!», «Бывай!», «Дабранач!».

Маналагічнае маўленне

Уменні, якія фарміруюцца:

разумець выказванні, змест тэксту на ўзроўні значэнняў, адказваць на пытанні: «Хто?, Дзе?, Куды?, Калі?, Што?». «Паведамі, куды ішлі хлопчыкі?». «Раскажы, што здарылася з імі?»;

аб'ядноўваць паміж сабой у лагічнай паслядоўнасці і структурна спалучаць некалькі сказаў для выражэння камунікатыўнага намеру і рашэння моўнамысленчых задач з выкарыстаннем розных апор: маўленчага ўзору, разгорнутых планаў, сюжэтнага раду, фатаграфіі і гэтак далей;

паведамляць (інфармаваць, распавядаць) пра сябе, пра сябра, пра сям'ю;

разумець і ствараць маналагічныя выказванні-апісанні;

апісваць паслядоўна падзеі дня, выкарыстоўваючы малюнкі, фатаграфіі;

апісваць гародніну, садавіну, расліны, жывёл і іншае;

апісваць прадметы ў іх параўнанні (вылучыць галоўныя прыкметы, адзначыць падабенствы і адрозненні);

апісваць надвор'е, поры года, прыроду (па асабістых назіраннях, ілюстрацыях, з апорай на рухомую аплікацыю, па калектыўна складзеным плане і іншае);

разумець і ствараць маналагічныя выказванні-апавяданні;

расказваць пра прачытанае, пачутае;

састаўляць пераказ, які ўзнаўляе змест, паслядоўнасць падзей;

расказваць пра ўбачанае, складаць апавяданне па карціне, сюжэтнай серыі;

расказваць па зададзенай тэме (з апорай на фотаздымак, сюжэтную карцінку, сюжэтны шэраг, складзены план, апорныя словы і іншае);

выказвацца прадуктыўна, выбіраць і выкарыстоўваць дакладныя факты, звесткі;

планаваць паведамленне, каб аптымальным шляхам дасягнуць рэалізацыі сваёй задачы, праводзіць сваю стратэгічную лінію;

весці гутарку лагічна і звязна, паслядоўна выкладаць думкі, факты, меркаванні ў адпаведнасці з задачай выказвання;

гаварыць выразна, выкарыстоўваючы правільна лагічны націск, выкарыстоўваючы розныя інтанацыйныя структуры;

прымаць удзел у рабоце парамі і групамі.

Вучэбна-пазнавальныя ўменні, якія фарміруюцца:

ажыццяўляць пад кіраўніцтвам настаўніка пошук патрэбнай інфармацыі;

ажыццяўляць аналіз аб'ектаў з вылучэннем істотных і неістотных прыкмет;

ажыццяўляць сінтэз як складанне цэлага з частак;

праводзіць параўнанне і класіфікацыю па зададзеных крытэрах;

усталёўваць прычынна-выніковыя сувязі;

планаваць сваё дзеянне ў адпаведнасці з пастаўленай задачай;

ажыццяўляць пакрокавы і выніковы кантроль выканання дзеяння;

прымаць удзел у рабоце парамі і групамі.

Маўленчы этыкет

Уменні, якія фарміруюцца:

вітаць каго-небудзь: «Добры дзень!», «Прывітанне!», «Добры дзень (раніца, вечар)!»;

развітвацца: «Да пабачэння», «Пака»;

дзякаваць: «Дзякуй!», «Вялікі дзякуй»;
прыносіць прабачэнні: «Выбачайце»;
выказваць просьбу: «Дайце, калі ласка!», «Можна ўвайсці (выйсці, узяць)?».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Вучні ведаюць і разумеюць:
этыкетныя выразы, прынятыя ў вывучаных сітуацыях (прывітанне, падзяка, прабачэнне, просьба);
умеюць:
праяўляць маўленчую актыўнасць, уступаць у размову адэкватна задачам створанай сітуацыіі;
разумець маўленчы матэрыял, які выкарыстоўваецца для арганізацыі навучальнага працэсу;
разумець і выконваць даручэнні і загады;
разумець рэплікі суразмоўцы і рэагаваць на іх адэкватна сітуацыі: паведамляць, інфармаваць, падцвярджаць, пярэчыць, дзякаваць;
весці мікрадыялог, запытваючы і пераказваючы інфармацыю ў межах вывучанага моўнага матэрыялу;
самастойна або па пытаннях настаўніка пераказваць прачытанае;
ствараць невялікія маналагічныя выказванні па кожнай з вывучаных тэм (з апорай на фотаздымак, сюжэтную карцінку, рухомую аплікацыю, гатовы план, апорныя словы);
падбіраць неабходныя моўныя сродкі для выражэння думак;
мадэляваць моўнымі сродкамі рэчаіснасць, выкарыстоўваць вывучаныя мадэлі выказванняў.
Выкарыстоўваюць у паўсядзённых зносінах і практычнай дзейнасці набытыя ўменні:
асэнсавана ўспрымаць невялікі па аб’ёме маўленчы матэрыял;
абдумана адказваць на пытанні;
разумець і выконваць даручэнні;
падтрымліваць размову на знаёмую тэму;
расказваць пра падзеі з асабістага жыцця.
Колькасць рэплік на кожнага субяседніка – 2–3.
Выгляд маналагічнага выказвання: апавяданне, апісанне.
Аб’ём выказвання – 3–5 фраз.

## II КЛАС (34 г.)

